# Музей беларускіх народных музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Музей беларускіх народных музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў быў створаны ў канцы 1990-х гадоў па ініцыятыве музыканта, даследчыка, педагога, стваральніка і кіраўніка фальклорных ансамбляў «Крупіцкія музыкі» і «Гуды» Уладзіміра Мікалаевіча Грома (1951—2008). З 2008 года музеем кіравала Ларыса Аляксандраўна Густова-Рунцо, з 2012 года яго ўзначальвае Таццяна Мікалаеўна Бабіч. Установа дзейнічае пры навукова-творчай лабараторыі «Беларускія народныя музычныя інструменты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў». У розныя гады тут працавалі Уладзімір Гром, Ігар Мангушаў, Аляксандр Крамко, Віктар Кульпін, Вячаслаў Калацэй, Алесь Сурба.

Асноўнымі напрамкамі работы навукова-творчай лабараторыі і музея беларускіх народных музычных інструментаў з'яўляюцца: атрыбуцыя корпуса традыцыйнага інструментарыя Беларусі; даследаванне спецыфікі паходжання, распаўсюджання і сучаснага бытавання музычных інструментаў беларусаў на аснове існуючых літаратурных крыніц, апісанняў, запісаў інфармантаў і аналізу рэальнай практыкі функцыянавання народных музыкантаў-інструменталістаў у розных формах традыцыйнага музіцыравання; фіксацыя форм функцыянавання інструментальнай музыкі, рэпертуару, своеасаблівасцей інструментаў, выканальніцкіх тэхнік, прыёмаў ігры, ладамадальных, меладычных і рытмаструктурных прыкмет лакальнай этнічнай традыцыі; засваенне і захаванне традыцый музіцыравання на беларускіх аўтэнтычных інструментах; аднаўленне, рэканструкцыя і рэстаўрацыя музейнай калекцыі; арганізацыя экскурсій у музеі беларускіх народных інструментаў; этнакультурнае выхаванне дзяцей і моладзі сродкамі беларускай традыцыйнай народнай культуры і інш.

Праца Музея беларускіх народных музычных інструментаў складаецца з навукова-даследчай, экспедыцыйнай, адукацыйнай дзейнасці з мэтай фарміравання рэсурснай базы, збору этнаінструментазнаўчай інфармацыі і інш. Асноўная мэта дзейнасці — вывучэнне, адраджэнне, захаванне (архіваванне) і засваенне традыцыйнага беларускага музычнага інструментарыя ў этнічных і прэзентатыўных (сцэнічных) формах, а таксама далейшае развіццё народна-інструментальнай выканальніцкай школы.

У экспазіцыі музея сабрана ўнікальная калекцыя традыцыйных беларускіх музычных інструментаў. Усе экспанаты рэпрэзентаваны па секцыях: струнныя, духавыя, ударныя інструменты, якія характарызуюцца ў адпаведнасці з асаблівасцямі іх канструкцыі і гучання, спосабам вырабу і дэкору, спецыфікай бытавання, рэпертуарам і інш.

Дзеючы фонд музея складаюць музычныя інструменты і прыстасаваныя да музычнай дзейнасці прадметы быту (лыжкі, гаршкі, падковы), традыцыйныя, аўтэнтычныя і мадэрнізаваныя, дыятанічныя і храматычныя, выраблены майстрамі-аматарамі і фабрычныя народныя інструменты (усяго больш за 150 адзінак). Самыя старадаўнія з іх адносяцца да сярэдзіны 19 стагоддзя. Гэта струнны шчыпковы інструмент цытра (нямецкай фабрыкі) і фісгармонія (з прыватнай калекцыі сям'і Громаў). У фондах музея прадстаўлена рэдкая калекцыя струнных інструментаў, сярод якіх скрыпкі, альт, басэтлі народных майстроў Вячаслава Пратасевіча, Усевалада Жукоўскага, колавая ліра Аляксандра Жукоўскага, фабрычныя — нямецкая (плоская) і неапалітанскія (выпуклыя) мандаліны, балалайка, гітара, майстравыя дыятанічныя цымбалы.

Самая вялікая і разнастайная група духавых інструментаў. Яна ўключае інструменты простыя па сваёй канструкцыі, запазычаныя з прыроды, зро-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бленыя народнымі майстрамі, а таксама фабрычныя (кларнет, труба, валторна і інш.). Духавыя інструменты адрозніваюцца формай, памерамі, строем, матэрыялам вырабу (дрэва, метал, косць, скура жывёл, гліна). Усе яны маюць спецыфічныя акустычна-гукавыя якасці, выканальніцкія магчымасці, а таксама характэрныя функцыі. Сярод экспанатаў дуды майстроў Уладзіміра Грома, Віктара Кульпіна і Алеся Сурбы, акарыны Дзяніса Грома, дудкі, жалейкі, саломкі Уладзіміра Грома і Віктара Кульпіна, шматлікія свісцёлкі і інш.

Гонарам музея з'яўляецца калекцыя беларускіх дуд. Інструменты выраблены маладым беларускім майстрам Алесем Сурбам. Ім жа праведзена рэстаўрацыя некаторых духавых і струнных інструментаў. Асобна экспануюцца гармонікі («хромкі», «венкі»), акардэоны, баяны, банданеон, губныя гармонікі з прыватнай калекцыі Міхаіла Слізкага (1944 — 2015). Усяго налічваецца больш за 70 інструментаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі, Італіі. Самы стары экспанат — петраградскі гармонік «трохрадка», які быў створаны ў 1911 годзе.

Значныя па колькасці ўдарныя і шумавыя інструменты: драўляныя кляшчоткі, трашчоткі, рагулькі, металічныя і гліняныя званочкі, падковы, талеркі, трохвугольнікі, варганы, барабаны. Сярод іх хатнія прылады (рубель, гаршкі, лыжкі), расліны (т. зв. «баршчавік» — зроблены з атрутнай расліны, а таксама зерне збожжа, гук якога імітуе шум дажджа). Калекцыя музея папаўняецца інструментамі іншых нацыянальных культур, такімі як арабскі уд, армянскі дудук, кітайскія цымбалы (янцынь) і інш.

На базе музея пры навукова-творчай лабараторыі беларускіх народных музычных інструментаў праводзяцца лекцыйныя заняткі і экскурсіі для школьнікаў, студэнтаў, гасцей і міжнародных дэлегацый.

***Т.М. Бабіч,***
*кандыдат мастацтвазнаўства,*
*старшы выкладчык кафедры*
*беларускай і сусветнай мастацкай*
*культуры Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў.*

Экспазіцыя Музея народных музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
*З фонду Музея народных музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.*

The exposition of the Museum of national musical instruments of Belarusian State University of Culture and Arts.
*From funds of the museum of folk musical instruments, Belarusian State University of Culture and Arts.*





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ